Przesyłka opłacona ryczałtem
№ 3 (32) Нядзеля 30-га студня, 1927 г. м. Вільня Год II

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць ... Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адр... ...рыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмократызм.—Барацьба з комунізмам.—Нацыянальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл.
„ „ „ 3 „ 2 зл. 50 гр.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Fabryczna 39.
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—10 гр.
за радок нонпарэля.

Жоўтая комуністычная нябясьпека.

Год таму назад у аднэй з сваіх перадавіц намі была падкрэсьляна магчымасьць для Эўропы азіяцкай небясьпекі. Прызнаемся, што гаворачы аб гэтай небясьпецы, мы самі ня думалі, што яна гэтакая бліская. У сучасны момант мы зьяўляемся сьведкамі, як падымаецца Далёкі Усход. Многа вякоў сьпячы 600 мільённы Кітай прачхнуўся і падымаецца. Хто мог сказаць, яшчэ год назад, што ў 1927 годзе палова Кітаю будзе комуністычнай?

Гэта сяньня ёсьць фактам. Так званая кантонская народная, а інакш кажучы бальшавіцкая, армія заняла палуднёвую частку Кітаю. Інструктарамі і камісарамі у гэтай арміі служыць маса расейскіх комуністаў. Праўда дыктатарам усяго Кітаю аб'явіў сябе камандуючы антыбальшавіцкім войскам маршал Чан-Со-Лін, у радах якога знаходзіцца моцны атрад расейскага гэнэрала Нечаева. Але дыктатура Чан-Со-Ліна на поўдня не сягае. Глаўная-ж небясьпека з боку кантонскіх войскаў гэта тая, што іх інспіратары і саюзьнікі—бальшавікі вельмі хітра выкарыстоўваюць тую ненавісьць, якую эўрапэйцы, а асабліва англійцы самі выклікалі ў кітайцаў да сябе. Выкінуўшы лёзунг нацыянальнага вызваленьня Кітаю ад залежнасьці яго ад Эўропы, Японіі і Амэрыкі-гэты стары і спрабаваны бальшавікамі спосаб, бальшавікі лоўка распаляюць ненавісьць кітайцаў да эўрапэйцаў. І трэба прызнаць, што рэзультаты перад намі надта паважныя. Гэткім чынам згубіўшы апошнюю надзею на падняцьце сусьветнай рэвалюцыі ў Эўропе, перажываючы страшэнныя ўдары з боку г. з фашызму, які абхоплівае ўсё больш і больш Эўропу, бальшавікі рашылі адыграцца на Далёкім Усходзе.

І тое, што робіцца сяньня ў Шанхае і Ханькоу ёсьць новы, пасьля забастоўкі вуглякопаў, ня менш балючы ўдар па Англіі. А там прыдзе чарга на ўдар і па іншым калёніям эўрапэйскім у Кітаі.

Праўда, у Кітай пасылаюцца эўрапэйскія ваенныя караблі і войска. Але ні хітраумны Альбіон, ні старая Эўропа, вядучы змаганьне з бальшавікамі на Далёкім Усходзе, не вядуць ніякой барацьбы з бальшавікамі тутака ў Эўропе, не разумеючы, што толькі тутака ў Эўропе ў самай чырвонай Маскве можа быць задушаны гад, які бянтэжыць увесь сьвет і пагражае новай жоўта-комуністычнай небясьпекай змогшай было комуністычную заразу ў Эўропе.

Зямельная праблема у Польшчы.

У папярэднім нумары нашае газэты мы падалі сьпіс маёнткаў буйнай ўласнасьці, якія ўрад, паводле закону 28 сьнежня 1925 г вызначыў на мэты зямельнае парцэляцыі шляхам прымусу. Гэтым урад выпаўніў першы фармальны крок прадбачэнай у законе штогодняй парцэляцыі. Гэта добры пачатак, за якім павінна разьвіцца далейшая, ўжо пляновая і рашучая акцыя выкананьня зямельнага закону.

Тутака мы не маем замеру крытыкаваць самы Закон 1925 г., які, як ведама. заместа шырокай социяльна-эканамічнай рэформы, меўшай перабудаваць усе хворыя зямельныя, адносіны ў польскай дзяржаве, абмяжаваўся тым, што пад пагрозай прымусовай парцэляцыі праз урадовыя ўстановы коштам і рызыкай земляўласьніка — фактычна даў толькі пэўныя рамкі, варункі і кантроль прыватнай парцэляцыі. Што ж. датычна беларускіх абшараў, дык Закон 1925г. ня толькі не спыніў назаўсёды асадніцтва, чаго дамагаюцца ўсе бяз вынятку беларускія партыі і групы, а з імі і ўвесь беларускі народ, але наадварот—даў яму вельмі выдатнае мейсца ўва усей акцыі падзелу зямлі ў нашым краі. Можна сказаць, што закон гэты паставіў мясцовае беларускае насяленьне ў горшае палажэньне ў параўнаньні з асаднікамі. Дый сам законадаўца шчыра назваў гэты закон „Законам аб парцэляцыі і асадніцтве". Ад шырокага размаху Закону 1920 г. у законе 1925 г. засталося вельмі мала. Але-ж і далей мы павінны з жалем сцьвердзіць, што ўсё тое, што дагэтуль робіцца ў Польшчы з зямельнай рэформай наагул, а нават з тым яе сурагатам, які прадстаўляе 925 г. адымае вялізарную частку веры ў тое, што народ хлебароб —бяз якіх — небудзь надзвычайных падзеяў атрымае зямлю наагул...

Каб зразумець усю важнасьць зямельнай рэформы, каб зламаць той страшэны апор, які спатыкае запраўдная зямельная рэформа ў клясавым эгаізьме магутных абшарніцкіх сфэраў, патрэбна запраўды-ж нялюдзкая сіла дзяржаўнага розуму і дзяржаўнай волі!

Дык дагаварым да канца: без глыбокіх небясьпечных патрасеньняў, якімі няўхільна пагражае далейшае зацягваньне зямельнай рэформы, скажам яшчэ ясьней: без аграрнай завірухі, а мо' і рэвалюцыі, гэта можа зрабіць у Польшчы адзін толькі—Маршалак Пілсудскі!...

Што зямельны лад у Польшчы — глыбока і наскрозь хворы, у гэтым ня сумляваецца, здаецца, ніхто. Даволі сказаць, што побач з 2 мільёнамі ста тысячамі селянскіх гаспадарак, абшарам менш як 5 гэктараў (а з іх звыш мільёну маюць менш як 2 гэктары!), побач з гэтымі запраўды ня тольк-галоднымі, але папросту „сьмяротнымі" гасі-падаркаміі—стнуе шмат (асабліва ў Галіцыі і ў нас) вялізарных маёнткаў па некалькі дзесяткаў тысячаў гэктараў. Кожнаму ясна, што гаспадарка на 2 гэктарах ня толькі ня можа выжывіць сялянскую сямью, але наогул не дае ніякай карысьці і самой дзяржаве. Гэтыя мільёны абшарніцкай зямлі незалюдненай — і гэтыя мільёны хлебаробаў без зямлі страчаны перад усім для дзяржаўнага скарбу, бо ня могуць даць maximum'у выдатнасьці. Гэткае марнаваньне як зямлі так і працы людзкай ня можа сабе дазволіць ні водная з сучасных дзяржаваў, асабліва ж Польшча, што нядаўна ў апошняй сваей прамове сцьвердзіў міністар Станевіч. Ён сказаў, што Польшча „павінна для здабыцьця сабе належнага ей мейсца пад сонцам, не зьменшаць, але павялічваць свае дзяржаўныя выдаткі, але зразумела толькі шляхам абсалютнага павялічэньня грамадзкага даходу краю. А гэтага апошняга можна дасягнуць толькі разьвіцьцем краевай гаспадаркі,-ў якой на першым мейсцы стаіць праца хлебароба на ральлі".

На зямельную рэформу трэба глянуць яшчэ з аднаго боку, апрача чыста эканамічнай стараны. Трэба канстатаваць, што вясковае насяленьне яшчэ зусім нядаўна ў Польшчы была вельмі варожа настроена да комунізму. У 1925 годзе пасол Міхальскі яшчэ толькі перасьцярагаў аб небясьпецы, якую нясе за сабою зьбядненьне польскай вёскі. „Сяньняшняя вёска ў Малапольшчы, казаў ён, „шпаркім крокам ідзе да аканчальнага згаленьня і вельмі хутка можа зрабіцца асяродкам комуністычнага руху". А сяньня, дзякуючы, галоўным чынам, згаленьню вёскі— мы маем страшэнна ўзросшыя ўплывы комунізму ня толькі ў нашых суседніх з СССР абшарах, але і ўва ўсей Польшчы, як гэта яскрава сьведчаць пасьпехі сярод сялянства пралетарска-комуністычнай „Незалежнай Партыі Хлопскай" і „Грамады.

Што ж фактычна робіцца з зямельнай справай у Польшчы? Ці дзяржаўная ўлада разумее ўсю важнасьць пагражаючай небясьпекі ад далейшага зацягваньня зямельнай рэформы?

Ці выконваецца прынамсі Закон 25 году аб правідловай парцэляцыі буйна — ўласьніцкай зямлі на карысьць безьзямельнага і малазямельнага вясковага пасяленьня? На гэтае пытаньне адкажам голасам польскай дэмакратычнай прэсы. Перадусім трэба сьцьвердзіць, што толькі цяперака — праз год ад прыняцьця закону, — урад прыступіў да апрацаваньня „выканаўчага распараджэньня", аб правядзеньні ў жыцьцё закону 1925 г. А вось што не так даўно казаў аб тым, што робіцца з законам, ведамы пэпэсавец п. Квапіньскі:

„Праўду кажучы, выкананьне Закону мае толькі яшчэ распачацца. Пакуль што мы маем масавую, прыватную парцэляцыю, пры якой беззямельны і малазямельны ў большасьці выпадкаў зямлі набыць ня можа, з прычыны адсутнасьці крэдытаў для іх ў помач пры пакупцы зямлі... „Як доказ гэтых сваіх слоў п. Квапіньскі прыводзіць страшэнна малую суму бюджэту міністэрства зямельных рэформаў — у 32 мільёны злотых, з якой толькі 7 мільёнаў вызначана на мэты парцэляцыі.

„Уся справа зямельной рэформы, казаў ён далей, калі яна будзе тым жа способам трактавана ўрадам і надалей, скончыцца дзікім скандалам на вёсцы" і што „за зямлю пачнецца барацьба, якую распачне вясковы пралетарыят, які пацягне за сабою сялянства" („Robotnik" № 300). А ў „Robotnika" № 340 п. Квапіньскі нядаўна сказаў: „Сялянскія масы спадзяваліся, што пасьля таго, як Маршалак Пілсудскі ўзяў уладу, іх на палавіну — нявольніцкае жыцьцё зьменіцца на лепшае" У тым, што гэтыя надзеі не спаўняюцца падрываецца аўтарытэт на вёсцы да тварца маёвага перавароту...

Мы сказалі вышэй, што лічым толькі аднаго Маршалка Пілсудскага здольным і сільным направіць усё тое, што наробдена ў Польшчы папярэднімі, шовіністычнымі ўрадамі у палючай справе надзяленьня зямлёю беларускага хлебароба. Але трэба прызнаць, што справа зямельнай рэформы на нашых беларускіх землях—яшчэ значна цяжэй для зразуменьня ды выкананьня для польскай улады, як у цэнтральнай Польшчы. Калі напрыклад у Кангрэсоўцы наогул цяжка перамагчы крэпкі клясавы эгаізм польскага абшарніка на карысьць польскага хлебароба, дык клясавы эгаізм крэсовага абшарніка шукае сабе апоры ў момэнтах рознага роду, як нацыянальных, палітычных, нават мілітарных і г.д. Даволі ўспомніць, што нашае віленскае „Słowo" пры першай заметцы аб прыступленьні Ураду да выкананьня зямельнай рэформы заалярмавала грамадзянства артыкулам пад загалоўкам „Надзяленьнё зямлёй гурткоўцаў"!

Дык ясна, што для зразуменьня істотнай павагі дый неабходнасьці правядзеньня шырокай і рашучай зямельнай рэформы і ў першую чаргу якраз на гэтых крэсах, ня гледзючы ні на якія ахвяры, запраўды патрэбна надлюдзкая сіла розуму і волі. І зноў у заключэньне паўторым, што адзіным толькі ў Польшчы чалавекам, які можа ня толькі зразумець, але і даканаць гэтага багатырскага чыну, зьяўляецца Маршалак Пілсудскі. Што б не казалі нашы праціўнікі, але на гэтага чалавека сяньня скіраваны вочы беларускага селяніна, трацячага раўнавагу і цярплівасьць. Аутарытэт гістарычных чынаў як у прошласьці, так і ў сучаснасьці імпануе сялянскай масе. Дык ці ж спадзеваньні гэтай масы ня споўняцца? Ці ж Пілсудскі ня здужае для карысьці Дзяржавы пайсьці на гэты ахвярны крок. Думаем, што здужае!

Тэррор Грамады як сыстэма барацьбы.

Што Грамадою ўжываўся індывідуальны тэррор у адносінах да сваіх палітычных ворагаў, аб гэтым гавораць самі за сябе факты зарэзаньня Івашкевіча і забойстваў Іголкі і Скарыны. Газэты падаюць вестку, што 21 студня г. г. па пастанове камітэту гуртка в. Асовец, павету Вілейскага сябрамі гэтага камітэту быў забіты Янка Смолік. Усіх забойцаў арыштавалі.

Гэта ўжо новы факт тэррору ўжо пасьля разгрому Грамады. На днях нам прыслана паведамленьне, што ў Алеся Баля, сэкрэтара павятовага камітэту Грамады ў Слоніме, падчас вобыску паліцыя знайшла *сьпіс некалькіх асобаў*. На запытаньне паліцыі, што гэта за сьпіс, Баль адказаў, што з гэтымі асобамі *трэба зрабіць асобісты разрахунак*. Гэты сьпіс складаўся амаль не выключна з сяброў і прыхільнікаў Беларускай Нацыянальнай Рады. А калі прыняць пад увагу, што з боку грамадаўцаў да нашых сяброў ужо не адзін раз былі *пагрозы*, дык зусім ясна, што гэты сьпіс быў праскрыпцыйным сьпіскам, а з тымі, хто быў у гэтым сьпісе Грамада мела замер паступіць гэтак, як яна паступіла з Іголкай, Скарынай і на днях са Смолікам. Інакш кажучы, тэррор грамадаўскі быў зьявішчам не прыпадковым, а *сыстэмай* барацьбы.

Дзеля гэтага, заклікаючы ўсіх нашых сяброў яшчэ адважней вясьці барацьбу з грамадаўскай заразай, папераджаемі адначасова быць асьцярожным і перад гнюснымі способамі, якія ўжывае Грамада.

Справа грамадаускіх арыштаваных паслоу у Сойме.

Міністар Справядлівасьці Мэйштовіч унёс у Сойм прапазыцыю пракурора віленскага акружнога суда аб выдачы судовым уладам арыштаваных паслоў Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага, Валошына, Мятлы і Галавача.

Абвінавачаны гэтыя паслы ў прыналежнасьці да Комуністычнай Партыі Польшчы і Ком. Партыі Зах. Беларусі і арганізацыі конспіратыўнай групы, кіруючай дзеяльнасьцю Грамады і Niezależnej Partji Chłopskiej.

Работа памянёных дэпутатаў ішла пад кіраўніцтвам комінтэрну.

Гэтак у ліпні 1925 году пасол Тарашкевіч атрымаў ад комінтэрну даручэньне арганізаваць „Беларускую Сялянска-Работніцкую Грамаду" і з гэтай мэтай, разам з паслом Рак Міхайлоўскім, прыняў удзел у канфэрэнцыі ў Гданске, з прадстаўнікамі іншае дзяржавы, комінтэрна, польскай компартыі і компартыі Зах. Беларусі.

На гэтай канфэрэнцыі Грамада падпарадкавалася польскай компартыі. Арыгінал акту гэтае умовы быў адпраўлены ў комінтэрн. Пасол Тарашкевіч прыняў на сябе абавязак аказаць дывэрсыйную ваенную помач іншай дзяржаве ў выпадку вайны яе з Польшчай і нават выклікаць аружнае паўстаньне ў Зах. Беларусі.

Для выпаўненьня гэтага пляну арыштаваныя паслы стварылі „ком'ячэйкі", як сярод сяброў сваіх арганізацый так і ў арміі.

Маюцца доказы, што арганізацыі, на чале каторых стаялі арыштаваныя паслы, займаліcь шпіёнствам на карысць іншае дзяржавы.

Роўным чынам ў Гданску была прынята пастанова арганізаваць банк, які фінансаваў-бы гэтую работу. Гэткі банк быў адчынены ў Вільні з адзеламі ў Пінску і Глыбокім. Банкавы капітал быў створаны на сродкі іншае дзяржавы, а не пры помачы сяброўскіх складак.

Установлена, што банк атрымліваў грошы праз Рыгу.

У арыштаваных знойдзены даляры і сьпісы асобаў, атрымліваючых сталую пэнсію.

Пасол Тарашкевіч абвінавачаны апрача таго ў уласнаручным састаўленьні праэкту цыркуляра цік'а польскай компартыі, у якім падрабязна распрацаваны плян антыдзяржаўнай дзеяльнасьці, у выдачы дакумэнтаў на выезд заграніцу, якія дакумэнты прызнаваліcь іншай дзяржавай, а такжа ў тым, што на канфэрэнцыі ў Гданску атрымаў ад агэнта іншае дзяржавы 15 тысячаў даляраў.

Пасол Валошын абвінавачаны ў тым, што арганізовываў военныя групы пры гуртках і муштраваў іх.

Пасол Рак-Міхайлоўскі ў тым, што стаў на чале натоўпу, нападаючага на віленскую турму і падбураў натоўп да аружнага выступленьня.

Пасол Мятла быў адным з кіраўнікоў Каапэратыўнага Банку і арганізовываў баявыя дружыны.

Пасол Галавач (N. P. Ch.)—арганізовываў дывэрсыйныя банды ў Навагрaдзкім ваяводзтве, падтрымліваў пастаянныя зносіны з іншай дзяржавай і неаднакроць пераходзіў нелегальна польска-савецкую граніцу.

Палітычны агляд.

Галоўнай тэмай палітычных гутарак у працягу ўсяго бягучага месяца было пытаньнэ аб разаружэньні Нямеччыны. Тлумачыцца гета тым, што з 1 лютага вайсковы кантроль пераходзіць з рук спэцыяльнай вайсковай кантрольнай камісіі хаўрусьнікаў, сядзібай якой быў Бэрлін, у рукі Лігі Народаў. Дзеля гэтага канфэрэнцыя паслоў у Парыжы запатрабавала ад Нямеччыны тлумачэньня ў тых нарушэньнях вэрсальскага трактату адносна новых крэпасных фартыфікацыяў на Усходняй нямецкай граніцы і гандлю ваенным матэрыялам, якія былі разкрыты ў апошні час. З гэтай місыяй нямецкі ўрад выслаў да Парыжа гэн. Павэлса.

Гэнэрал Павэлс прыбыў да Парыжу з агульнікoвымі інструкцыямі ад нямецкага ўрада, якія давалі яму магчымасць зацягваць перагаворы, каб не давясьці іх да канца гэтага месяца, калі ўсе спрэчныя пытаньні аб разаружэньні перайдуць у Лігу Народаў. І гэтую місыю ён выпаўніў найлепш. Першае спатканьне Павэлса з прадстаўнікамі хаўрусьнікаў не дало ніякіх вынікаў. Ен вярнуўся ў Бэрлін за новымі інструкцыямі. А гэтым часам надыйдзе 1 лютага, калі ўжо голас аднэй Францыі ці Англіі ня будзе мець рашучага значэньня ў пытаньнях аб нямецкіх уваружэньнях. А там, калі нават ня будзе дасягнута згода і канфлікт пяройдзе ў Лігу Народаў, ці ў наступную інстанцыю Гаагскі трыбунал, дык да таго часу можа шмат што зьмяніцца. Гэткім чынам і на гэты раз немцы вельмі спрытна вывярнуліся з прыгатаваных для іх пастак.

Найбольш была зацікаўлена ў выніках гэтых перагавораў Польшча, якой безпасрэдна пагражаюць нямецкія ўваружэньня. Воесь дзеля чаго ўвесь гэты час амаль ня ўсе польскія газэты няўпынна білі трывогу з поваду нямецкіх уваружэньняў і пагрозаў, яўна скіраваных проці польскай граніцы. Каб зразумець сэнс гэтай трывогі, даволі прывясьці некалькі наступных здарэньняў і лічб, якія гавораць самі за сябе.

Наперакор вэрсальскаму трактату, які забараняе немцам будову новых фортыфікацыяў на сваіх граніцах, яны прывялі ў баявую пастаць крэпасьць Кэнігсбэрг, у якой сабралі каля 4,000 палявых гармат для будучай арміі. Затым апрача застаўшыхся ўкрапленьняў Мазурскіх вазёр, якія згулялі вельмі паважную ролю ў часе вайны 1914—17 г. з Расеяй, немцы збудавалі каля 70 новых бэтона-зялезных фартоў удоўж польскай граніцы, зрабілі з старых крэпасьцяў Кюстрына, Франкфурта на р Одэры і Глагаў зусім новыя крэпасьці, скіраваныя проці Пазнані. Некаторыя фарты Глагаў раскінуты у 15 кіламэтрах ад польскай граніцы. І ўсе гэтыя крэпасьці, заданьнем якіх будзе прыкрываць новую фармуючуюся нямецкую армію ў выпадку вайны з Польшчай, засталіся незакранутымі, ня гледзячы на пратэст з боку польскай дыпляматыі і публічнай апініі.

Але гэта толькі дробная частка з усяго таго, што прымушае Польшчу біць на алярм на ўвесь сьвет з повады нямецкіх уваружэньняў, дасягнутых у часе ваеннага кантролю над імі. Другая вайна, як ведама, будзе рашацца ў паветры. Галоўнымі прыладамі другой вайны будуць аэрапляны і розных гатункаў газы і ў гэтым кірунку Нямеччына дасягнула ў 1926 г. поўную пераваґу на Эўрапэйскім матэрыку. Вось якія ўвагі па гэтаму поваду робіць вядомы польскі публіцыст Адольф Навачынскі ў „Gaz. War. Por.“ (N 15). Будучая сусьветная вайна—піша А. Навачынскі — і вялікі рэванш, падгатаваны немцамі, пачнецца з нападу нямецкіх паветраных эскадраў, на ўсе сталіцы і прамысловыя цэнтры прылягаючых к Нямеччыне дзяржаваў з мэтай навясьці на іх паніку. Ужо цяпер немцы маюць найбольшы лік аэрапланаў, найбольшую цыфру аэраплянавых фабрык (40), найбольшы лік пілоцкіх школаў (40 у ліні 1926 г.), найболей густую сецць паветранай камунікацыі і найбольшае ўдасканаленьне паветраных апаратаў і матораў. Пасьля выдачы ў 1918 г. хаўрусьнікам 2,000 аэрапланаў немцы мелі ў 1921 г. толькі 34 пасажырскіх аэрапляны. У 1924 г. гэты лік павялічыўся да 476, у 1925 г.—4,729, ці 1000 прац. разьвіцьця.

У 1926 г. немцы перавязьлі на сваіх паветраных лініях 55,000 пасажыраў, заставіўшы ў хвасьце Анлію, Амэрыку і Францыю. На 132 паветраных камунікацыйных лініяў сьвета 62 прыходзіцца на Нямеччыну, ці на 45 нямецкіх ліній у 1926 г. прыхадзілася 5 англійскіх. Немцы ў апошні год вайны выраблялі па 2,000 аэрапланаў у месяц. Цяпер адзін толькі Фокер (нямецкая фабрыка вайсковых аэрапланаў у Галяндыі, бо ў сябе дома няможна будаваць вайсковых аэрапланоў) будуе кожны дзень 30 аэрапланаў самай лепшай канструкцыі. Апрача краёвых фабрык немцы маюць яшчэ свае фабрыкі, выключна вайсковыя ў Швэйцарыі, Даніі, Голяндыі, Швэцыі і Расеі. Як самі немцы прызнаюцца, у іх кожны год прыбывае на 1,000 пілотаў. Але гэта не згаджаецца з праўдай, калі ўзяць пад увагу, што з паловы 1926 г. ў Нямеччыне кожны тыдзень адкрываецца новая школа пілотаў. Ужо цяпер агульны лік нямецкіх пілотаў перавышае 2 ,000.

Што-жа тычыць хіміі, якая будзе на услугах авіацыі ў будучай вайне, дык немцы сталі на першым месцы перад вайною і ў часе апошняй вайны і захавалі гэгэмонію і цяпер.

Падобна фабрыкам аэрапланаў і школам пілотаў яны маюць ня меншы лік хімічных фабрыкаў і навукова-дасьледчых хімічных інстытутаў і лябораторыяў, дзе працуе цэлая армія хімікаў пад кіраўніцтвам вучоных прафэсараў з сьвятовымі імёнамі. У гэтых фабрыках і лябораторыях выраблюцца розныя атручываючыя газы

У гэта ўсё рабілася у часе акупацыі Прырэйна і Рурскага басэйну, у часе функцыяў ваеннай кантрольнай камісіі хаўрусьнікаў, калі яшчэ ня было ні Лёкарна, ні Туары, ні жалеза стальнога трэсту, ні палітычнага дагавору з Італіяй і калі немцы не засядалі у Лізе Народаў. Што-ж цяпер будзе пасьля ўсяго гэтага, калі касуецца кантрольная камісія і калі прэзыдэнт фэльдмаршал Гіндэнбург проста на ваеннаму загадаў быўшаму канцлеру Марксу стварыць цэнтра правы кабінэт, у якім фактычнымі кіраўнікамі будуць нацыяналісты, якія не знаходзяць патрэбным хаваць тое, што яны гатовяцца да вайны, у першую чаргу з Польшчай, каб вярнуць свае быўшыя вобласьці — В. Сілезію, Пазнань, Паморʼе і Гданск?

N.

Максім Багдановіч.

СОНЭТ*).

Прынадна вочы зьяюць да мяне;
Чароўна усьміхаючыся, губы
Аткрылі буйныя, бялеючыя зубы...
Ласкавы шэпт... Гарачай хваляй мкне

Kроў к сэрцу маему. Мана ўсё, або не?
Ці верыць мілым абяцанкам любы?
Моʼ гэты жар, пылаючы для згубы,
Хавае сьцюжу пад сабой на дне.

Так іншы раз, над соннаю зямлёю
Агністаю дугою залатою
Прарэжа цемень яркі мэтэор.

Гарыць ён, іскры сыпе і нясецца
Бліскаючы мацней ад ясных зор,—
А ў глыбіне халодным астаецца.

*) Гэты верш М. Багдановіча, выяўляючы першарадную літэратурную цэннасьць, не ўвайшоў у зьмест вядомага „*Вянка*“, а толькі друкаваўся ў аднэй з беларускіх газэт, дзеля таго мала знаёмы беларускаму грамадзянству.

Бальшавіцкі суд у кітайцаў.



Характерная фатаграфія „народнага суда“ ў Кітаі ў раёне занятым чырвонымі кітайцамі.

Апошнія навіны.

У Польшчы.

ДЗЯРЖАЎНЫ СЭКРЭТАРЫЯТ ПА СПРАВАМ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЬЦЯЎ. Як падае „Kur. Por.“ у найбліжэйшым часе пры прэзыдыуме Рады Міністраў будзе арганізаваны дзяржаўны сэкрэтарыят па справам нацыянальных меншасьцяў. Як ведама праэкт утварэньня гэткага сэкрэтарыяту ўжо не адзін раз абгаварываўся ў урадовых колах.

Начальнікам сэкрэтарыяту мае быць вызначаны полкоўнік Славэк, які лічыцца асобай добра абзнаёмленай з палажэньнем пытаньня меншасьцяў у Польшчы, асабліва з беларускай і ўкраінскай справамі.

Як ведама палкоўнік Славэк вёў у свой час перагаворы, як адзін з польскіх дэлегатаў, з Пятлюрай і ўрадам Украінскай Народнай Рэспублікі.

Апрача палк. Слаўка на гэтае становішча высоўваюцца кандыдатуры: 1. Васілеўскага (аднага з трох сябраў камісіі экспэртаў) і праф. Каліноўскага

РЭЗЫГНАЦЫЯ МІНІСТРА МАРАЧЭЎСКАГА З ПАСОЛЬСКАГА МАНДАТУ. Міністар Марачэўскі, аднача сна пасол Сойму ад П. П. С. зрокся свайго пасольскага мандату.

НОВЫ МІНІСТАР ПОЧТАЎ і ТЭЛЕГРАФУ. Новавызначаны міністар почтаў і тэлеграфу Б. Медзінскі злажыў прысягу і прыступіў да выпаўненьня сваіх абавязкаў.

КОЛЬБАН У ВАРШАВЕ. Прыбыў да Варшавы начальнік сэкцыі нацыянальных меншасьцяў пры сэкрэтарыяце Лігі Народаў Кольбан. Прыбыў ён з Катавіц.

Кольбан прыбыў да Польчы для высьнэньня палажэньня нямецкае меншасьці на „Горнай Сілезіі“.

ПОЛЬШЧА і АФГАНІСТАН. На гэтых днях выехаў да Кабулу, сталіцы Афганістану, кіраўнік рэфэрату Далёкага Усходу, міністэрства заграгічных справаў, п. Патоцкі.

У Кабуле Патоцкі будзе прыняты каралём Афганістану.

Патоцкі мае прыгатаваць грунт для навязаньня нармальных дыпляматычных адносінаў паміж Польшчай і Афганістанам.

НОВЫЯ ЗАЛАТЫЯ МАНЭТЫ. Выпаўнены першыя залатыя манэты вартасьцю ў 10 і 20 зл. З аднаго боку манэты выбіты партрэт караля Балеслава Храбрага з надпісам 1025 — 1925 г.

„ЛЕЯЛЬНАСЬЦЬ“ САВЕЦКАГА ПАСОЛЬСТВА ў ВАРШАВЕ. Уладай арыштаваны ў Варшаве нейкі Узданскі, комуніст, які прыпадкова папаўся ў рукі паліцыі.

Як аказваецца Узданскі да апошняга часу быў урадоўцам савецкага пасольства ў Варшаве, гдзе і хаваўся перад арыштам.

„ДЗЯДЫ“

Паэма А. Міцкевіча.

(*Пераклад*).

„*Дзяды*“, — тачней іхняя II-я частка, апісуючая беларускі, народны абрад „Дзяды“ — зьяўляецца — казаў той — найбольш беларускім мейсцам у творчасьці несьмяротнага аўтара „*Пана Тадэуша*“.

Вартасьць іхнюю ўзмацняе тое, што Міцкевіч, у маладых гадах і сам бываў ня раз з сваей Марыляй на „дзядох“ (якія тады спраўляліся ня так бледа як сяньня),—дзеля чаго надта-ж верна перадаў ў сваей паэме усе чыннасьці абрадаў.

„Дзяды“, гэтак завецца урачысты абрад ў чэсьць памёршых, звычайна ў пераддзень Усіх Сьвятых спраўляны ў царкве на цьвінтары; ўвесь помысел ўзяты з вясковых сьпеваў, а наʼт формулы заклінаньняў і інкантацыяў тлумачылі мы з мовы літоўскае (?)“ — кажа паэт ў аднэй з сваіх прадмоваў да „*Дзядоў*“.

Дзеля таго, каб чытач мог праканацца як блізка падыходзіў да справы Міцкевіч, даем тут для параўнаньня пару арыгінальных заклінаньняў па Шэйну:

(ў пачатку абраду) „Сьвятыя дзяды, завём вас!
„Сьвятыя дзяды, ідзіце да нас!
„Есьць тут усё, што Бог даў,
„Што я лі вас ахвяраваў,
„Чым толька хата багата.
„Сьвятыя дзяды, просім вас,
„Хадзіце, ляціце да нас!

(у канцы-жа) „Сьвятыя дзяды! вы сюды прыляцелі,
„Пілі і елі,
„Ляціце ж цяпер да сябе,
„Скажыце, што яшчэ вам трэба?
„А лепш ляціце да неба!
а кыш, а кыш!“

Калі і можна закінуць якую нясьцісласьць Міцкевічу, дык гэта апісаньне ежы, складанае дзядом.

Гэткія рэчы як: „ciastka; pączki; chrósty“— даволі-ткі трудна ўвабразіць ў хаце сялянін, ды-й яшчэ ў тыя часы!

Цікава, што абрад „дзядоў“ быў пашыраны амаль што выключна сярод беларусаў — праваслаўных, каталіком ён мала ведамы.

Гэную цэнную для беларусаў паэму,— быццам то ўсенькую — пераклала нядаўна вядомая беларуская песьнярка Н. Арсеньнева; на жаль пераклад, за выняткам невялічкага адрыўку, друкаванага летась ў „*Студэнцкай Думцы*“, дасюль яшчэ сьвету не пабачыў!

Трэʼ было-б парупіцца з выданьнем прынамсі II-гое часткі гэтак важнае і цікавае для беларусаў паэмы!

Што датыча нашага перакладу (адрывак з II-гой часткі), дык зроблены ён яшчэ ў 1923 г. ў Вільні, але дзякуючы агіднай нядбайнасьці п. Марцінчыка, які „гаспадаруючы“ праз пэўны час ў рэдакцыі „*Студ. Думкі*“ нейкімсь дзіўным чынам „згубіў“, бы тую іголку ў сене, адзіны экзэмпляр, 10 старонак лічучага, перакладу, — ўсю працу прыйшлося перарабляць ў другі раз!

Ў перакладзе нашым мы імкнуліся прадусім да *точнасьці* так у перадачы зьместу, як і вытрыманьні разьмеру вершу, а гэтак жа стараліся, колькі мага, захаваць рамантычны дух паэмы і тае эпохі, калі яна была пісана; ці ўдалося нам гэта, хай судзяць чытачы!

„*ДЗЯДЫ*“. *Частка II-гая* (*адрывак*). *Гусьляр* (*кіраўнік абрадаў*). — *Старац першы з хору.* — *Хор сялян і сялянак.*

КАПЛІЦА, ВЕЧАР.

Хор.

Цёмна й глуха ўсюдых,—людзі!
Што тут будзе, што тут будзе?

Гусьляр.

Зачыньце дзьверы капліцы
І станьце ўкруг дамавіны;
Ні воднай лямпы, ні сьвечкі
Ў вокнах завесьце тканіны,
Хай месяц, што там бліскае,
Праз шчыліны не ўгледае.
Толькі рупна, ў воднай хвілі.

Хор.

Як казаў—так і зрабілі.

Хор.

Цёмна й глуха ўсюдых, — людзі!
Што тут будзе, што тут будзе?

Гусьляр.

Чысцовыя душачкі!
Ў якойськольвечы старане:
Ці тая, што гарыць ў смале,
Ці,—што мерзьне на дне рэчкі,
Ці што, дзеля вялікшых кар,
Ў сырое ўшчэпленая пнішча,
Калі грызе у печцы жар,
Плача жаласна і пішчэ:
Кожна сьпяшы да грамады!
Грамада хай тут зьбярэцца!
Сягоньня сьвяткуем дзяды!
Выходзьце у сьвятыя ўзьмежжа,
Тут і пацер вам знайдзецца
Есьць піцьцё тут, ёсьць і ежа.

Хор.

Цёмна й глуха ўсюдых,—людзі!
Што тут будзе, што тут будзе?

Гусьляр.

Дайце мне жменю кудзелі.
Запаляю, вы ж з пасьпехам
Як вагонь у гору стрэле
Падганяйце яго дэхам;
Вось так, далей хай імчыць
Ажно на ляту згарыць.

Хор.

Цёмна й глуха ўсюдых,—людзі!
Што тут будзе. што тут будзе?

Гусьляр.

Ўперад вы лёгкія духі,
Што між гэнага падолу
Цемразі і завірухі,
Нуды, плачу і мазолу,
Заблішчэлі і згарэлі
Бы тая жменька кудзелі,
Хто з вас ветраў блудзе шляхам,
Не ўзьляцеў да небных краін,
Таго лёгкім, ясным знакам
Прызываем, заклінаем.

Хор.

Кажце, што каму бракуе?
Хто галодны, смагу чуе?

Гусьляр.

Гляньце у гору, над намі,
Што там пад стольлю бліскае?
— Залацістымі крыламі
Дзецяў двое калыхае.
Як лісток з лістком ў павеве,
Кружаць над царквы вярхолкам;
Як голуб з галубком на дрэве,
Так ангялок грае з анёлкам.

Гусьляр і старац.

Як лісток з лістком ў павеве,
Кружаць над царквы вярхолкам;
Як голуб з галубком на дрэве,
Так ангялок грае з анёлкам.

Ангялок *да аднэй з сялянак*:

Да мамы ляцім, да мамы.
Не спазнала-ж матка Юзі?
Я-жа Юзя, той-жа самы!
Вось сястрычка мая, Рузя.
Цяпер дом наш—раю брамы.
Тамака лепш чым у мамы.
Глянь! Галоўкі ў зор вянкох,

Фінансы і Гаспадарка

Вываз збожжа.

Для барацьбы з бязупынным ростам цэнаў на хлеб, урад увёў вывазную пошліну на жыта, жытнюю муку і пшаніцу на працяг часу ад 21 сгудня да 1 сакавіка гэтага года. Пошліна гэта складае 15 зл. за цэнтнар (100 кілаграмаў) Гэты сродак мае сваёю мэтай апрача барацьбы з дарагоўляю хлеба (жыта падаражэла ад ліпня з 2,82 даляраў за 100 кілаграмаў на 4,26 дал., а пшаніца з 4,60 дал. на 5,72) спыненьня нясуменнага вывазу гэтых прадуктаў за граніцу, адкуль скора прыдзецца ўвазіць з паваротам па значна вышэйшай цане.

Ураджай ў прошлым годзе, як ведама, быў благі, пшаніцы — 1,300,000 тонаў (тона раўняецца 61 пуду), жыта—5,200,000 т., ячменя—1,600,000 т. і ўса—3 000,000 т. У па раўнаньні з 1925 г. збор пшаніцы складаў 81 проц., жыта—66 проц., яравых прадуктаў—92 прац.

Вядомы польскі статыстык Эдвард Штурм дэ Штрэм, спэцыяліст па збожавым справам, зрабіў наступныя цікавыя аблічэньні: аблічыўшы ўраджай жыта і пшаніцы разам 62,927,000 квінталаў (квінтал—6 пуд. 4 фунт. 44 зал.) і палічыўшы да гэтага рэшткі леташняга запасу, а потым адлічыўшы патрэбнае збожжа на засеў, застанецца для пражыцьця 56,098,000 кв. Штурм-дэ-Шрэм аблічае патрэбнасьць для корму на адну галаву ў год 188 кілагр., хаця неўраджай картоплі і яе дарагоўля (цана ў прошлым годзе 3,5 зл за 100 кілагр., а сёлета 15—18 зл.) патрабуе большага расходу хлеба. Але прылагаючы нават і гэту лічбу на адну галаву, патрабуецца для ўсіх жыхароў Польшчы каля 55,930,000 кв. Адсюль вынікае, што свабодны запас жыта і пшаніцы, які можна экспартаваць за граніцу бяз шкоды для дзяржавы і насяленьня, ня перавышае 168 кв., ці 16,800 вагонаў. А як жа выглядае экспорт на практыцы?

Паводле афіцыяльных даных экспорт збожжа 4 гатункаў з Польшчы ў 1926 г. прадстаўляецца ў наступным кшалце: Жыта вывязена 222,515 тон. (пасьля жніва да сьнежня 115,632 тонны), пшаніцы — 53,011 тон (па жніве — 16,402), ячменя 138,011 т. (па жніве—63,572) і аўса 62,718 т. (па жніве — 11,113 тон.) Гэткім чынам у працягу толькі 4 летніх месяцаў—ліпень—сьнежань вывезена 14,060 вагонаў пшаніцы і 74,370 вагонаў па 10 тонаў жыта. Усярэднім у месяц вывазілася па 18,590 вагонаў жыта і 3,515 вагонаў пшаніцы. Але у сьнежні вываз ужо значна ўпаў дзеля вычарпаньня лішкі запасу і не перавысіў 3,000 вагонаў жыта і 500 вагонаў пшаніцы. Наагул увесь выназ быў выкліканы ня столькі патрэбнасьцю пажывы, колькі необходнасьцю атрымаць грошы на падаткі. Прыхадзілася недаядаць, а вывазіць. Ужо цяпер адчуваецца вялікі недахват збожжа на ўнутраным рынку. І ў той час, як па адным дар гам збожжа вывозіцца з Польшчы за граніцу, па другім увозіцца з Румыніі, Юга Славіі, Вэнгрыі і Баўгарыі да Польшчы па значна ніжэйшым цэнам. Да сьнежня было прывезена: жыта — 7,775 тон. (пасьля жніва—6,488 т.), пшаніцы—6,009 т. (па жнівах—5, 523 т.) і аўса 1,641 т. (па жніве—1,500 т.).

Гэткім чынам увядзеньне вывазной пошліны на жыта і пшаніцу трэба лічыць спозьненым сродкам, які не акажа заметнага ўплыву на цану збожжа на ўнутраным рынку. І трэба лічыцца, як гэта было ў 1924 г., з значным прывозам збожжа з заграніцы. Ці можна такую гаспадарку назваць рацыянальнай?

S.

Ліквідацыя Грамады.



Правадыры комуністычна-пралетарскай Грамады, арыштаваныя ўладай за падгатоўку „сацыяльнай рэвалюцыі ў Польшчы з мэтай далучэньня да бальшавіцкага раю, паслы: Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Валошын і Мятла

Крэдыты на засеў.

7 студня адбылася ў міністэрстве скарбу канфэрэнцыя прадстаўнікоў міністэрства скарбу, земляробства і дзяржаўнай маемасьці, роўна зямельнага банку па пытаньню аб крэдытовай акцыі для дробнага земляробства ў сувязі з вясеньнімі засевамі. На канфэрэнцыі ўстаноўляны разьмер необходнай пасеўнай крэдытовай помачы паводле прапазыцыі міністра земляробства, роўна спосаб разьдзела крэдытаў. Згодна з дасюлешняй практыкай крэдыты будуць падзеляны між асобнымі ваяводзтвамі, а ў ваяводзтвах падзел зробяць ваяводзкія камітэты. Крэдытная акцыя будзе праведзяна Дзяржаўным Земляробскім Банкам часткова са сродкаў, атрыманых з уплаты старых засеўных крэдытаў, часткова-ж з новых асыгнаваньняў, атрыманых на гэтую акцыю ад міністэрства скарбу.

Сусьветная прадукцыя льну (валакна) у 1926 г.

Дабыча льну ў рожных дзяржавах ў 1926 г. у параўнаньні з 1913 г. прадстаўляецца ў наступным кшталце у тоннах (у крэсках абазначаны лічбы 1913—14 г.). Расея (411,500) 245,700 т. Польшча (—) 16,000, Літва (38,276) 39,300 т., Латвія (18,000) 19,000 т., Эстонія (16 000) 10,460 т., Нямеччына (3,580) 8,000 т., Францыя (20,899) 18,000 т., Бэльгія (23,5 6) 15,000, Голяндыя (9,674) 6,500, Ірляндыя (13,164) 6,000, Чэха-Славакія (800) 1,135, Італія (,500) 3,500, Японія (14,097) 5,000, рэшта дзяржаваў (43,893) 65,000 тон.

Біржа.

27.I. 27 г.

Даляры	8,98—8,95 зл.
Рублі зал. . . .	7,74 зл.
Рублі сярэбр. . . .	2,81 „
Чырвонец . . .	34—40 зл.

Збожжа.

(*Варшава*).

Жыта (100 кілагр.) . . .	41,50 зл.
Пшаніца	53 зл.
Авёс	31,80 зл.
Ячмень браваровы . . .	36 зл.
Ячмень крупяны . . .	34 „

(*Віленшчына*).

Жыта	48 зл.
Пшаніца	53—57 зл.
Ячмень брав.	36—37 „
Ячмень крупяны . . .	34 зл.
Авёс	32—33 „

Маленькі фэльетон.

У Менскім Трыбунале.

(*Глядзі „Беларускае Слова" №№ 29, 30, 31*).

І падсудны, залажыўшы рукі ў кішані, неяк звысака і на'т вясёлымі вачамі, паглядзеў на публіку і на судзяў...

Старшыня (звоніць і да публікі): Прашу публіку не перашкаджаць разгляду справы і дыскусыйных пытаньняў не падымаць. — Прайшлі ўжо часы, калі Народны Трыбунал быў праўдзівай трыбунай для народу і экспэрымэнтам Суда. рэвалюцыйнага сумленьня і цялерака, калі нашая Улада, напрактыкаваўшы на рэвалюцыйным будаўніцтве чырвонае Расеі, паступова пачала пераходзіць на пачаткі перадрэвалюцыйныя. — Суд наш гэтак сама моцна стаў на грунце старых законаў і ахоўвае патрэбны парадак і правідловасьць судаводзтва і дзеля гэтага патрабуе і каб...

Голас з публікі: Гэта ж стары рэжым!... Сьменавехаўцы!...

Старшыня (нэрвова затрымаўся і ягоная чорная казьліная бародка неяк задрыгала, а пэнсэ амальшто не захадзіла на носе): Папераджаю публіку апошні раз, бо інакш буду змушаны прыняць іншыя меры... (да экспэртаў) А паважаную экспэртызу прашу ўжо на гэты раз даць сваё заключэньне — правакацыя гэта, ці не?!...

Ад экспэртаў, зірнуўшы з падлоб'я адным вокам сьпярша на публіку, пасьля на падсуднага, падымаецца Міхась: З боку гледжаньня экспэртызы правакацыя сама па сабе, як гэтакая—дрэнь! А калі разглядаць гэтае слова па ягоным складу, дык адразу заўважым, што на першым мейсцу стаіць „права", пасьля ідзе „кац", ну а рэшта... ўжо усім вядомая і сама сабой разумеецца.. Прарадзіцель яе вельміпаважаны Азэф...

Галасы з публікі: Што гэта ён тамака пляце?!...

— Здаецца сам нейкую правакацыю разводзіць!...

— Голас грамадзяніна Каца: Я пратэстую!... Мая фамілія пры чым?!...

Старшыня: Прашу экспэрта ня ўхіляцца ў бакі і бліжэй да справы...

Экспэрт Міхась: Я-ж і падходжу да справы.. Для нас экспэртаў, калі падыймаецца якое сумліўнае пытаньне, мы мусім даць яму высьвятленьне з ўсіх бакоў..

Старшыня: Але прашу толькі ня ўплётваць прозьвішчаў тутака прысутных на салі грамадзян...

Экспэрт Міхась: Выбачайце!.. Іду далей: разглядзім тое, што стаіць на першым мейсцу... Што такое ёсьць „права"?!... (і ён ізноў зірнуў адным вокам на судзяў і на публіку). У буржуёў гэта ёсьць права мацнейшага над слабейшым, багацейшага над бяднейшым, разумнейшага над дурнейшым, спрытнейшага над наіўнейшым і г. д.

— Гэта ў іх, у буржуазных дзяржавах, дзе, быццам, права кожнага грамадзяніна ахоўваецца законам... Зусім інакш гэта ў нас, у Рабоча-Сялянскай Рэспубліцы, у Сацыялістычнай дзяржаве, гдзе ўсе грамадзяне роўныя, усе маюць аднальковыя правы, апрача толькі невялічкае часьцінкі, як буржуі, абшарнікі, папы, кулакі, эсэры, сацыялздраднікі, безпартыйная інтэлігэнцыя, рабочыя, селяне...

Галасы з публікі: Што гэта за пералічэньне?!...

— Далоў!... Годзі!... Гэта-ж ужо праўдзівая правакацыя!...

— Досыць!.. Ня трэба экспэртызы!..

Старшыня пазваніў...

Экспэрт Міхась (пра сябе): Здаецца зарапартаваўся... Дрэнь!...

Абвінавацель (які за ўвесь час прамовы Міхася нэрваваўся, ёрзаў па крэслу, зіркаў то на публіку, то на Міхася і нарэшце, прыняўшы нейкае станоўчае рашэньне, ня вытрымаў і перарваў экспэрта):

— А прашу экспэрта бліжэй да стала... А скажыце, калі ласка, ці тамака, калі вы былі ў Вільні, вы часам не яшкаліся з беларускімі эсэрамі?!... Ці ня праз вас гэта яны атрымлівалі грошы з заграніцы?!.. Ці ня вы гэта давалі ім прытулак?!

Экспэрт Міхась (пра сябе): Дрэнь!... Чразвычайкай засмуродзіла!..

Абвінавацель: Што-ж вы маўчыцё?... Я буду змушаны... (бярэ паперку і хоча нешта напісаць).

Экспэрт Міхась: Я не разумею, паважанага абвінавацеля, ці гэтае запытаньне тычыцца маёй экспэртызы, ці маёй асобы?!...

Абвінавацель: І таго і іншага... Але паміж вашай экспэртызай і вашай асобай прaглядае досыць цесная сувязь з беларускай эсэраўшчынай... і я прашу даць адказ на мае запытаньні...

Экспэрт Міхась: Ах, калі гэтак?!... Дык... калі ласка — я падцьвярджаю, што ўсе гэтак і было...

Галасы з публікі: Здраднік! Арыштаваць яго!...

— У чэка на дапрос!...

Абвінавацель: Ах, гэта ўсё вы рабілі?!... А ці можна пацікавіцца, каму-ж гэта напрыклад вы так дапамагалі?!...

Экспэрт Міхась (зірнуўшы на старшыню, быццам абрадваўся): А як-жа, як-жа... я памятаю—вось напрыклад нашаму паважанаму старшыне Трыбуналу...

За граніцай.

НЯЎДАЛАЯ СПРОБА ПЕРАВАРОТУ ў ЛАТВІІ. У невялічкім горадзе Латвіі Вальмар з тыдзень таму назад здарылася гісторыя, якая ніяк ніяк ня можа зыйсьці з шпальтаў газэт.

Малады лейтэнант латвійскай арміі падвыпіўшы з прыяцелямі ў рэстаране ўздумаў зрабіць пераварот. Доўга не задумываючыся, лейтэнант Оліньш скіраваўся да вайсковых казармаў і падняў на трывогу сваю роту. Падняўшы яшчэ адну роту, інструктара якой ужо прышлось арыштаваць, Оліньш раздаў жаўнерам патроны і пайшоў на горад. Там ён заняў пошту, тэлеграф і чугуначную станцыю.

Як толькі батальённы камандзір даведаўся аб гэтым, загадаў паўстаўшым жаўнерам арыштаваць Оліньша, што тыя і зрабілі. Выступленьне такім чынам было зьліквідавана, а Оліньш папаў пад ваенна-палявы суд

АНТЫСАВЕЦКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ Ніжагародзкае Г. П. У. напала на сьлед моцнай антысавецкай контрэвалюцыйнай арганізацыі, маючай свае аддзелы ў ва ўсіх прамысловых раёнах губэрніі. Гэтая арганізацыя правяла за леташні год 11 забастовок і некалькі выступленьняў проці ўлады. Па адрывачным дадзеным вучасьнікамі выкрытай арганізацыі былі выключна квалфікаваныя работнікі і невялікая група інтэлігэнцыі.

КАМПРАМІС ПАМІЖ МЭКСЫКАЙ і ЗЛУЧ. ШТАТАМІ. Як відаць спрэчка аб нафце паміж Зл. Штатамі і Мэксыкай скончыцца кампрамісам. Канфэрэнцыя мэксыканскага міністра гандлю з прадстаўнікамі нафтавых кампаній шмат дапамагла гэтаму Праз міністра гандлю, урад Мэксыкі даў зразумець, што ён гатовы дазволіць нафтовым кампаніям вясьці далейшую эксплёатацыю аж да вырашэньня справы судом. Па думцы мэксыканскіх палітычных колаў безпасрэднай небясьпекі аружнага канфлікту ўжо няма. Прадстаўнікі Зл. Штатаў заявілі, што яны згаджаюцца на трэцейскі суд

КІТАЙ. Палажэньне ў Кітаі завастраецца. Кітайцы пачынаюць барацьбу з усімі, без вынятку, чужаземцамі. Барацьба гэтая мае пасьпех. Апошнім часам ізноў здарылася шмат нападаў і эксцэсаў. Амаль усе кітайскія партыі пачалі барацьбу з эўрапэйцамі. Асабліва цяжкае палажэньне эўрапэйцаў у Шанхаі.

Аднак магчыма, што супольнае выступленьне ўсіх эўрапэйскіх дзяржаваў направіць палажэньне, тымбольш, што антыбальшавіцкі гэнэрал Чанг-Со-Лін, які мае міліённую армію, і не раз ужо пабіваў чырвоных — ізноў наступае. Але прадбачыць усяго таго, што можа здарыцца, ня можна.

Апошнія весткі кажуць, што Чанг-Со-Лін атрымаў вялікую пабеду над чырвонымі.

А тымчасам эўрапэйцы пасылаюць да Кітаю і флёт і войска.

ФРАНЦУСКА - РУМЫНСКІ ДАГАВОР. Апублікаваны у Парыжы і Бухарэсьце тэкст дагавора паміж Францыяй і Румыніяй. Францыя і Румынія забавязуюцца аказваць адна аднэй помач у выпадку нападу трэцяе дзяржавы.

Дагавор ня выходзіць з рамак пакта аб Лізе Народаў і зьяўляецца дапаўненьнем да дагавораў Францыі з Польшчай, Бэльгіяй, Чэхаславакіяй і Югаславіяй.

КРЫВАВАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ ПЕРАД ЛІТОЎСКІМ ПАСОЛЬСТВАМ у БЭРЛІНЕ. З Бэрліна паведамляюць, што 20 студня перад будынкам літоўскага пасольства адбылася дэманстрацыя комуністаў, якую разагнала паліцыя. Пры спатычцы з паліцыяй было ранена шмат комуністаў.

ФРАНЦУСКІ ЎЛЬТЫМАТУМ С. С. Р. Р. Францускі ўрад мае замер паведаміцць Ракоўскага (савецкага пасла) аб ультыматыўных трэбаваньнях па пытаньню перагавораў адносна ліквідацыі даўгоў Расеі.

Францускі ўрад трэбуе ад бальшавікоў ня толькі прызнаньня старых даўгоў Расеі, але і пакрыцьця шкодаў, зробленых французам у Расеі, з прычыны рэвалюцыі.

Калі гэтыя трэбаваньні выпаўнены ня будуць, дык францускі ўрад адкліча свайго пасла Эрбэта з Масквы.

ЗЕМЛЯТРАСЕНЬНЕ Ў ЯПОНІІ. У цэнтральнай Японіі шмат шкоды зрабіла землятрасеньне. У месьце Іокогаме зруйнавана больш як 600 дамоў. У Іокагамскім парту патанула звыш 10 параходаў.

Вопраткі з косак сьвятляных,
А ў кожнага з нас на плячох
Двое крыльляў матыльчаных.
Ў раі ўсё добра гэтак,
Што дзень то гульня іная,
Дзе ступім — траўка ўзрастае,
Дзе кранем — там поўна кветак.
Ды хоць ўсе там добра гэтак,
Мучыць нас нуда й трывога,
Ах, мама для тваіх дзетах
Спынена ў неба дарога!

Х о р.

Ды хоць ўсё там добра гэтак,
Мучыць іх нуда й трывога,
Ах мама для тваіх дзетак
Спынена ў небе дарога!

Г у с ь л я р.

Чаго-жа трэба для душы
Каб дастацца ёй да неба?
Ці просіш ўздыхнуць да Бога?
Ці аб частунак салодкі?
Есьць тут сыр, масла, пірагі,
Яблыкі ёсьць і ягодкі.
Чаго-жа трэба для душы
Каб дастацца ёй да неба?

А н г я л о к.

Нічагуські нам ня трэба.
Праз лішню слодач на зямлі
Няшчаснымі зрабіліс мы.
Я ў працяг жыцьця маёга
Горкага ня знаў нічога;
Пяшчоты, цукеркі, сваволі,
А што зраблю, дык усё — цаца!
Пяяць, скакаць, бегчы ў поле,
Нарваць кветак для Разалькі,
Вось была ўся мая праца,
Яе-ж праца — гуляць ў лялькі!
На дзяды жа мы зьявіліcь
Не каб вы за нас маліліcь;
Ня трэба нам ахвярнай мшы,
Ні малака, ці пірагоў.
Просім гарчыцы два зярны,
А гэны дар, такі прасты,
Лепш будзе ўсякіх адпустоў!
Бо чуйце і разважце добра людзі,
Што паводле Божага наказу,
Хто ня зьведаў бяды — горачы ні разу,
Той і ў небе шчасьлівым ня будзе!

Х о р.

Бо чуйце і разважце добра людзі,
Што паводле Божага наказу,
Хто ня зьведаў бяды — горачы ні разу
Той і ў небе шчасьлівым ня будзе!

Г у с ь л я р.

Анялочкі вы мае
Што жадалі, то бярыце,
Кожный хай зярнё бярэ,
Цяпер з Богам адыдзіце!
Калі ж к просьбам душа глуха:
Ў імя Айца, Сына, Духа!
Ці бачыш Панскі крыж?
Ня хочаце ежы тое,
Пакіньце-ж нас у спакоі,
А кыш! а кыш!

Х о р.

Калі-ж к просьбам душа глуха:
Ў імя Айца, Сына, Духа!
Ці бачыш Панскі Крыж?
Ня хочаце ежы тое,
Пакіньце ж нас у спакоі,
А кыш! а кыш!

(Зданьні зьнікаюць)

Канец зьявы 1-ай.

З польскае мовы пераклаў

Я. Сьветазар.

Вільня, 1923 г.

Абвінавацель (зьдзіўлена): Што?!... Нашаму паважанаму таварышу Пракулевічу?!..

Экспэрт Міхась: Ага, ага... і яму... (пра сябе: „пішы цяпераказ паперку“)..

Абвінавацель: Ну, дык тады, выбачайце... Я больш нічога.. (садзіцца зачырванеўшы).

Экспэрт Міхась: І я тады, выбачайце, больш нічога.. (садзіцца).

Голасы з публікі: Брава, брава!..

— Няхай жыве Міхась!..

Голас Любачкі: Канчайце ўжо гэтую валынку!... Францішэк, даражэнькі!...

Старшыня (пашаптаўшыся з судзямі, звоніць і калі запанавала ціша, устае): Пастанова Суда...

Прыстаў: Прашу публіку ўстаць!...

Старшыня: Дзеля таго, што падсудны, як вы чулі і бачылі зложыў нам аграмадны матэрыял, дзе прадуглежана ўсё тое, што мае сувязь з ягоным жыцьцём і праступкамі ў Польшчы, і што суд так хутка ня можа сам разглядзець гэты матэрыял, а нат у некаторых пытаньнях можа і ня зможа разабрацца—Суд пастанавіў разгляд усёй справы разам з падсудным перадаць у рукі асобнае Камісіі... Паседжаньне сёньняшняе закончана.. Прашу падсуднага вывясьці, а публіку разыйсьціся..

Дзесяць дзён „безстаронная“ камісія, у складзе некалькіх жыдоў і аднаго паляка дапрашвалі нашага артыста і драматурга беларускага.. А на адзінадцаты дзень па ўсяму Менску былі расклеяны абвесткі, што вядомы беларускі артыста і драматург Францішэк Аляхновіч выступіць у Дзяржаўным тэатры ў новай сваёй п'есе з жыцьця беларусаў пад Польшчай...

П'еса адобрана Інбелкультам і аўтару выдадзена награда ў 300 чырвонцаў.

А колькі ён выпацеў за гэты час, колькі і якіх думак праняслося ў ягонай галаве мы ня ведаем, але спадзяемся, калі ягонае сэрца ізноў знудзіцца па дарагой яму Вільні і ён вернецца на свой Антокаль, дык можа лік яго твораў павялічыцца і п'есай з жыцьця дзеячоў Радавай Беларусі...

(Канец).

Г—на.

Гутаркі аб гаспадарцы.

У апошнія часы шмат хто пачынае ўжываць штучныя навозы, каб павялічыць ураджайнасьць свайго поля, Але часта няведаюць, які трэба нав з ужываць, бо адна зямля патрабуе больш фосфару, іншая калійнага ўдабрэньня і г. д

Каб точна ведаць чаго зямлі не хапае—трэба зрабіць хімічны аналіз.

Але гэта не заўсёды можна. І вось нпр. у Усходняй Прусіі практыкуецца такі просьценькі спосаб, які дае магчымасьць без хімічнага аналіза знайсьці, якіх салей у зямлі не хапае.

Выбіраецца роўнае, па магчымасьці без ніякіх хаця-б і малых узгоркаў поле, з аднолькавай па сваей добраці зямлей Апошняя надта важна, каб досьлед удаўся і каб рэзультаты гэтага досьледу былі правільныя.

На выбраным полі адмерываецца кавалак ў 960 кв. саж. (40×14), ральля якога аднолькава і старанна выробляецца Гэты кавалак разьбіваецца на 16 дзялянак па 60 кв. саж. (6×10), пакідаючы паміж дзялянкамі вузкія межы. Такі кавалак з 16 дзяланкамі адводзіцца пад пасеў аднэй якой-небудзь расьліны — пры чым усе работы па прыгатаўленьні ральлі і пасеву павінны быць аднолькава старанными, з аднолькавай добрацьцю насеньня, лікам яго і адначасным пасевам. Усе 16 дзялянак такога пробнага вучастка нумэруюцца ў такой чарзе:

1	16	5	12
2	15	6	11
3	14	7	10
4	13	8	9

На гэтых дзялянках робяцца досьледы са штучнымі на оза і ў такім парадку:

Дзялянкі 1-ая і 9-ая ўгнаеньня не атрымліваюць. Дзялянкі 2 ая і 10-ая атрымліваюць поўнае штучнае ўгнаеньне, а ласьне для цяжкіх грунтаў даюць; супэрфосфата — 24 фунта, калійнай солі (30%) 6 фунтаў, чылійскай салетры 5 ф Для лёгкіх грунтоў — 36 ф., кайніта 36 ф., чылійскай салетры — 8 ф. Дзялянкі 3-ая і 11-ая атрымліваюць тое самае, што і дзелянкі 2-ая і 10-ая, але без калійнага ўгнаеньня. Дзялянкі 4-ая і 12 ая атрымліваюць тое, што і дзялянкі 2-ая і 10-ая, але без фосфарна-кваснага ўгнаеньня. Дзялянкі 5-ая і 13-я тое, што і дзялянкі 2 ая і 10-ая, але без азоцістага ўгнаеньня. Дзялянкі 6-ая і 14-ая атрымліваюць толькі адно калійнае ўгнаеньне. Дзялянкі 7-ая і 15 ая атрымліваюць толькі адно фосфарна-кваснае ўгнаеньне. 8-ая і 16-ая атрымліваюць толькі адно азоцістае ўгнаеньне. З гэтага відаць, што кожны досьлед робіцца для кантроля на дзьвюх дзялянках, і гэткім чынам маем 8 досьледаў. Параўнаньнем ураджаю 1-ай і 2-ой дзялянак можна зрабіць вывад аб значэньні для данай ральлі поўнага штучнага угнаеньньня. Пры параўнаньні ураджаю дзялянак 2 і 3 можна бачыць, якое мае значэньне фосфарна-кваснае і азоцістае ўгнаеньне. Пры параўнаньні ураджаяў дзялянак 2 і 4 якое значэньне маюць азоцістае і калійнае ўгнаеньня. Пры параўнаньні ураджаю 2 і 5-й якое мае значэньне фосфарна-кваснае і калійнае ўгнаеньне. Дзялянкі 6 ая і 14-ая, 7-ая і 15-ая, 8 ая і 16-ая пакажуць значэньне толькі аднаго калійнага, фосфарна-кваснага і азоцістаго ўгнаеньня

Пры гэтых досьледах трэба рабіць аднолькавы ўход за кожнай паасобнай дзелянкай, точна запісываючы ўсё — час руневаньня, красаваньня, пасьпяваньня, а таксама трэба збожжа з кожнай дзялянкі паасобку малаціць, каб ведаць сколькі кожная дзялянка дасьць зярна і саломы.

Гэты досьлед самы просты і даступны кожнаму гаспадару і больш менш точна паказвае, якога хімічнага ўгнаеньня патрабуе зямля.

УВАГА: Калійнае ўгнаеньне; калійная соль і кайніт; фосфарна-кваснае ўгнаеньне: тамашляк і суперфосфат; азоцістае ўгнаеньне — чылійская салетра.

Нашая табліца пробных дзялянак прытарнавана так, што кожная дзялянка = 1/10 часткі дзесяціны.

Каб ведаць, колькі трэба штучных навозаў на цэлую дзесяціну, трэба колькасьць на адну дзялянку — павялічыць у 10 разоў.

Б.

Тутэйшая хроніка.

Сьмерць Камісара Ураду п. Вімбара 24-га г. м. пасьля зробленай апэрацыі сьляпой кішкі памёр сьв. п. Камісар Ураду на м. Вільню Казімір Вімбар.

Нябошчык быў вядомым прыхільнікам дэмакратыі, а адначасова справядлівым і ўсемі паважаным адміністратарам, дзеля чаго ўсё насяленьне Вільні без розьніцы нацыянальнасьці з жалем спаткала перадчасную сьмерць сьв. п. Казіміра Вімбара.

Зьменавехаўства Сэрэбранікава. Адзіны расейскі пасол у Сойме з сьпісу № 16 п. Сэрэбранікаў выразна зьменавіхнуўся. Пры чым у гэтым пайшоў гэтак далёка, што зрабіўся адзіным прадстаўніком „Госіздата“ („государственнага Іздацельства“—бальшавіцкага, рэд.) на Польшу. На запытаньне розных расейскіх арган зацыяў Сэрэбранікава аб гэтым, апошні альбо нічога не адказвае, альбо грубіць, альбо ўхіляецца ад простага адказу. Здавалася бы справа ясная і такога тыпа трэба было бы расейскаму грамадзянству адразу жа закляйміць.

Аднак жа рашучасьць расейскай эміграцыі да бальшавікоў і розных зьменавехаўцаў істнуе толькі на паперы. Гэтак было і на сходзе віленскага адзелу Расейскага Нацыянальнага Аб'еднаньня, які адбыўся ў залі Крэнгеля 23 г. м., на якім было пастаноўлена „прасіць“ Сэрэбранікова выразна адказаць, бо папярэдняе яго тлумачэньне ў прэсе неяснае.

Можна вывязьці за граніцу толькі 1000 злотых. Усе асобы выезджаючы заграніцу маюць права вывязьці з сабою толькі 1000 зл. ці на гэткую жа суму валютаў. Хто хоча ўзяць з сабою больш грошаў, павінен мець асобны дазвол ад Ізбы Скарбовай.

Поуны развал Грамады.

У сувязі з поўнай кампрамітацыяй Грамады, як комуністычнай арганізацыі і дзякуючы адозвам Бел. Нац. Рады, усюды пачалося масавае выступленьне з Грамады сялян. Так намі атрыманы даныя аб распадзе адразу 10 гурткоў у Слонімшчыне і 14 у Наваградчыне; роўным чынам гэткія жа весткі надходзяць і з іншых паветаў. Падробнасьці пададзім у наступным нумары.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Пане Рэдактар!

Прашу абвесьціць у Вашай газэце наступнае:

Я сэкрэтар гуртка Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады ў в. Зарэчане, Гарадоцкае гм. Беластоцкага пав. пераканаўся, што гурткі Грамады зьяўляюцца антыдзяржаўнымі і комуністычнымі. Дзеля гэтага 16 студня г. г. я выпісаўся з Грамады.

Юльян Яроцкі.

в. Зарэчане, Беластоцкага пав., 24 студня 1927 г.

Жыцьце провінцыі.

„Работа“ грамадаўцаў.

(*Слонімшчына*).

Беларуская Нацыянальная Рада не адзін раз зварачывала ўвагу грамадзянства на комуністычны характар „гурткоў“ і іхніх правадыроў. Што правадыры працавалі ў комуністычным духу і толькі для.. „матушкі — чырвонай комуны“ і за яе грошы сьведчыць факт, што ў старшыні гуртка ў в. Пасінічы, Міжэвіцкай гм. — Сецькі, падчас рэвізіі 15. І паліцыя знайшла комуністычныя адозвы і інш паперы.

Вось, браты — сярмяжнікі, чым вас кармілі старшыні гурткоў! Гэтыя чырвоныя бандыты, платныя савецкія агэнты, прадавалі душу Беларускага Народу!

Слонімская хроніка.

У в. Рудаўка, Міжэвіцкай гм. 15 студня арыштаваны комуністычны дзеяч Турлай, старшыня гуртка Грамады.

Арыштаваны ў Селявічах Міжэвіцкай гміны грамадаўцы: Сьцяпан Серкевіч, Фр. Серкевіч, Янка Дэшка і Піліп Фенкевіч.

Сяляне вёсак: Махначы, Мыслава і Селявічы — бачучы, што старшыні гурткоў яўна працуюць у комуністычным напрамку, проста цяпер кажуць ім у вочы: — Вы зладзеі і агэнты бальшавіцкія. Для вас — здраднікаў — мала турмы Трэба вас прыпякчы гарачым жалезам столькі разоў, колькі даляраў бальшавіцкіх прайшло праз вашыя рукі.

Ведамы комуністычны шулер, Міхась Бэгэр з в. Вароніч, даведаўшыся аб арыштах іншых сваіх сяброў, ні на каго не чакаючы „згінуў“ у няведамым напрамку.

Мусіць „чыстая душа“ сядзела ў целе гэтага таварыша — старшыні гуртка.

На ўсіх кіраўнікоў, сэкрэтароў, скарбнікаў, мопраўцаў, сяброў па арганізацыі — Грамады надыйшло „смутное время“!

Паліцыя пазбірала ў грамадаўскіх правадыроў усе даляры, дык і німа каму даваць грошы на „працу“.

Беларусу няма месца.

(*Лебедзева, Маладэч. пав.*)

Есьць у нашым мястэчку польская урадовая школа.

Да нядаўняга часу вучыў дзетак нейкі Мікалайчук з Польшчы. Аб тым, як ён вучыў — гаварыць ня прыходзіцца Ды і як можа быць вучыцелем звычайны праступнік. Аб яго злачынстве ведае ўся ваколіца.

Гэты Мікалайчук выпісаў да сябе пляменніцу, дзяўчыну 14 гадоў. Гэта знача, каб гаспадарыла І тутка вось сталася брыдкая рэч. Мікалайчук дапусьціўся гвалту над сваей пляменніцай. Аб гэтым даведаліся ўлады і ён быў арыштаваны, але зараз-жа выпушчаны і нават болей таго, — і надалей вучыў дзяцей

Тады ня выцярпелі бацькі і пачалі пратэставаць. Інспэктар, якому відаць гэты Мікалайчук падабаецца, перавёў яго ў в. Лужок, Палачанскае гміны, дзе таксама ёсьць школа.

Тут ужо яму не пашанцавала і нават інспэктар ня змог дапамагчы, бо Мікалайчука сьледчы судзьдзя арыштаваў. Толькі праз нейкі час пад каўцыю быў ён выпушчаны і цяпер „zawieszony w czynnościach“, аднак атрымлівае палову пэнсіі.

А для таго, каб інспэктар забараніў яму выкладаць — патрэбна было ўмяшацельства і грамадзянства і судовых уладаў. Відаць таму — што ён з Польшчы.

Крыху інакш інспэктар паступае з беларусамі. Гэтак ён звольніў вучыцеля — беларуса ў тым-жа Лебедзеве за тое, што калі ў прошлым годзе прыехаў на візытацыю, дык дзеці, падчас сьпеваў, засьпявалі: „Marsz, marsz Piłsudski..“ заместа: „Marsz, marsz Dąbrowski...“ Трэба зазначыць, што гэта было перад майскім пераваротам.

Дык відаць, істнуюць у нашага інспэктара дзьве меркі...

Цікава, ці ведае аб усім гэтым віленскі куратар...

Лебедзеўскі.

Грамадаўскія фатаграфіі.

Панькевіч — старшыня гуртка ў Пудзічах — адміністрацыйна караны; быў сышчыкам у савецкай міліцыі.

——

Пятраш — старшыня гуртка ў в. Заполье, Наваградз. павету — быўшы комсамолец.

——

Старшыня гуртка Грамады ў Воронічах Слонімскага пав М. Бэгер падаў прапазыцыю на сходзе гуртковуцаў, каб ня піць гарэлкі. Добрая рэч!

Але пасьля гэтага як сьвіньня напіўся ў Слоніме.

Па сьвеце.

Сьнег у паўтары сажані.

З Самары ў Маскву паведамляюць, што сьнежныя заносы апошніх дзён гэтак вялікія, што аж 10,000 сялян, працуючых па ачыстцы чугуначнай лініі ад сьнегу, яшчэ ня справіліся з сваей работай. На лініях працуе 30 сьнегачысьціцеляў, якія да гэтуль ня справіліся. Праца вельмі трудная дзеля таго, што таўшчыня сьнежнае коўдры дасягае да паўтары сажані.

Нябывалая гарачыня ў Аўстраліі.

Зусім ня тое, што ў Расеі—робіцца ў Аўстраліі. Тут наадварот—дакучае вялікая гарачыня З Сіднэя тэлеграфуюць, што з прычыны нябывалае гарачыні шмат людзей згінула ад сонечнага удару. У адным месьце Адэлоідзе памёрла 7 чалавек. Шмат у якіх мясцовасьцях распачаліся лясныя пажары і шмат дзе адчуваецца недастача вады

Насяленьне С. С. Р. Р.

Лічбы апошняга перапісу ў Савецкай Расеі паказываюць вялікі прырост насяленьня ў гарадах у апошнія у гады. Гэтак у Маскве цяпер жыве 2 мільёна чалавек, ў Петраградзе 1,600,000 чалавек. Усяго ў С. С. Р. Р. жыве 150 мільёнаў чалавек.

Усячына.

КАБЕТА ГУБЭРНАТАРАМ ШТАТУ І ШТО З ГЭТАГА ВЫЙШЛА.

Як ведама ў Амэрыцы кабеты займаюць зусім роўныя месцы з мушчынамі. Есьць кабеты і адвакаты, і пракуроры і дырэктары і паліцэйскія камісары і г. д. Нават губэрнатарам штату Тэхас у Амэрыцы (крыху больш за ваяводу) аказалася кабета Фэргуссон. Дык цяпер суд гэтага штату адлажыў усе ўгалоўныя працэсы да канца студня — бо тады канчаюцца паўнамоцтвы губэрнаткі. Фэргуссон дала штату Тэхас „паводку паміласаваньняў“. У працягу двух гадоў яна амністыравала 3177 асобаў. Дык цяпер суд ня хоча працаваць і чакае новага губэрнатара.

ЭПІДЭМІЯ ГРЫПЫ.

Страшэнна пачала шалець цяпер у Эўропе хвароба грыпа (гішпанка або інфлюэнца). У ва ўсёй Заходняй Эўропе няма нават маленькага гарадка, дзе не хварэлі-б і не паміралі ад грыпы. Асабліва цяжка адчувае гэта Францыя. У Парыжы і іншых гарадах ужо не хапае трунаў, каб хаваць памёршых. Хваля гэтае хваробы захапіла Францыю, Гішпанію, Нямеччыну і Бэльгію. У апошнія часы пачалі хварэць на грыпу і ў Польшчы. Гэтак у Варшаве і Кракаве хварэючых лічаць тысячамі.

НЯ ТАК — ЯК У АМЭРЫЦЫ.

Фашыстаўскі ўрад у Італіі забараніў кабетам вучыцца ў унівэрсытэце на гэткіх факультэтах: філёзофічным, гістарычным і філёлёгічным Паводле фашыстаў кабета павінна займацца хатай і гаспадаркай.

Жарты.

Сярод жыдоў.

Параход тоне. На ім два жыды. Адзін плача другі сьмяецца.

— Чаго ты сьмяешся? Ці-ж ты не бачыш, што параход тоне?

--А што, гэта мой параход?

Пах компартыі.

Раней у комуністычнай партыі пахла часнаком а цяпер шашлыком.

Савецкі гумар.

Наш старшыня камітэту такі чалавек: за што ні возьмецца — ўсё ў яго выйдзе

— Напрыклад?

Узяўся за казённыя грошы, яны ў яго і выйшлі

* * *

— На сколькі працэнтаў удалося вам правесьці эканомію ў прадпрыемстве?

— На ўсе 100 працэнтаў!?? Прадпрыемства зьліквідавалі.

Паштовая скрынка.

Грамадзісту з Ружанскае гміны—дзякуем за памяць. Радзім трохі пачакаць, а мо на сваёй тоўстай скуры праканаецеся аб дабрадзействах Грамады Скажыце сумленна—колькі месячна атрымліваеце за службу. Бярыце як мага больш, бо ўсе роўна ня хопіць, як трапіце да турмы і пусьціце на вецер сваю гаспадарку, зразумела, калі толькі яна ў вас ёсьць.

Плаўсюку з Баранавіч — газету Вам высылаем. У карэспандэнцыях падавайце больш фактаў і пішыце карацей.

Рибіра з Кляноў — пробныя нумары „Беларускага Слова“ Вам пасылаем. Юрыдычныя парады даюцца толькі падпісчыкам газэты.

Кліманович Гіпаліт — газэту і інш. Вам высылаем.

Яроцкаму Юльяну—Вашае пісьмо зьмяшчаем. Газэту высылаем.

Кухальскі Янка, Шылько Эдмунд, Кулік Якуб, Сіцько Гальяш, Кумпяк Піліп, Хілько Пётра, Лукашэня Ніна — газэту высылаем.

М. Макарэвіч у Бэрліне, Мікола Чарвякоў у Эстоніі — „Беларускае Слова“ высылаем.

Малко Пётра, Войтус Міхал, Томко Янка, Касяк О. — пробныя нумары высылаем.

Сялянам в. Жалюбчыкі — у Вашым пісьме не напісана на чыё імя высылаць газэту. Прышліце дакладны адрэс.

У. Г.— па прысланым адрэсам газэту высылаем. Але іншым разам пішыце выразьней — бо ня ўсе адрэсы можна прачытаць.

Лебедзеўскаму — Вашую карэспандэнцыю аб школьных парадках падаем. Прысылайце больш.

Адказны Рэд. Т. Вернікоўскі. Друк. Пасьпешная, Вільня Біскупья 12. Выдавец Бел. Нацыянальная Рада.